ААВЛ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

***А.А. Корзюк***

Репозиторий БГПУ

# ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст. У АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЕ

Рэкамендавана Вучэбна-метадычным аб'яднаннем
вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па педагагічнай
адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў
вышэйшых навучальных устаноў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях:
1-020101 Гісторыя; 1-020102 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць

Мінск 2010

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ. № УК 4721

ГЛАВА

# 1 ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ» Ў IX КЛАСЕ І ЯГО АСАБЛІВАСЦІ

У адпаведнасці з Канцэпцыяй вучэбнага прадмета «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі», у IX класе вывучаецца гісторыя Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. [1, с. 5]. У гэты час беларускія землі знаходзіліся ў складзе Расійскай імперыі, таму вывучаемы перыяд ахоплівае гістарычныя падзеі ад іх уключэння ў склад Расійскай імперыі да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. і абвастрэння палітычнай сітуацыі ў краіне вясной-летам 1917 г. У Адукацыйным стандарце вызначаны наступны змест гістарычнай адукацыі па гісторыі Беларусі дадзенага перыяду [2, с. 10]:

*Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі. Сацыяльная і канфесійная палітыка. Грамадска-палітычны рух у XIX – пачатку XX ст. Зараджэнне беларускага нацыянальнага руху. Падзеі рэвалюцыі 1905–1907 гг. і Лютаўскай рэвалюцыі ў Беларусі. Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. Крызіс феадальна-прыгонніцкай гаспадаркі. Прамысловы пераварот. Асаблівасці правядзення буржуазных рэформ у Беларусі. Умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі. Стан навукі, адукацыі і культуры Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. Наш край у XIX – пачатку XX ст.*

Згодна з вучэбнай праграмай для IX класа [3, с. 52–57], зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 2009 г., змест вучэбнага матэрыялу, на вывучэнне якога адводзіцца 35 гадзін, складаецца з двух раздзелаў. У пачатку вывучэння кожнага раздзела прадугледжаны ўрок агульнай характарыстыкі становішча беларускіх зямель у разглядаемы перыяд; завяршае кожны з іх прадугледжаны вучэбнай праграмай урок абагульнення.

**Раздзел 1** «Беларусь на зыходзе феадалізму: канец XVIII – сярэдзіна XIX ст.». Разглядаецца палітыка расійскага ўрада ў Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст., становішча Беларусі ў перыяд Айчыннай вайны 1812 г., грамадска-палітычны рух у першай трэці XIX ст., палітычнае становішча ў 1830–1840-я гг., канфесійныя адносіны. У дадзеным раздзеле вывучаецца сельская



гаспадарка, становішча сялян і рэформы ў гэтай галіне эканомікі ў першай палове XIX ст.; стан прамысловасці, гандлю, гарадоў і мястэчак Беларусі ў гэты час; развіццё адукацыі, навукі, літаратуры і мастацтва ў першай палове XIX ст.

**Раздзел 2** «Усталяванне капіталізму на беларускіх землях: другая палова XIX – пачатак XX ст.». Паслядоўна вывучаюцца адмена прыгоннага права; развіццё капіталістычных адносін у вёсцы і прамысловасці ў парэформенны перыяд; стан гарадоў, развіццё гандлю, фінансаў і транспарту ў 1860-я – пачатку XX ст.; сялянскі і рабочы рух у другой палове XIX ст.; паўстанне 1863–1864 гг. у Беларусі; урадавая палітыка ў апошняй трэці XIX ст. У змесце раздзела сваё адлюстраванне знайшлі фарміраванне палітычных партый і рухаў, рэвалюцыйныя падзеі 1905 г. у Беларусі, грамадска-палітычнае становішча ў 1906–1914 гг., Сталыпінскія рэформы ў Беларусі, падзеі Першай сусветнай вайны і Лютаўскай рэвалюцыі на беларускіх землях. У дадзеным раздзеле раскрываецца абвастрэнне палітычнай сітуацыі ў Беларусі вясной – летам 1917 г., умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі, развіццё адукацыі, навукі, літаратуры, тэатра, жывапісу і архітэктуры Беларусі ў 1860-я гады XIX ст. – пачатку XX ст.

Структурны аналіз вучэбнага матэрыялу дазваляе зрабіць выснову, што 46,4 % яго зместу складаюць пытанні грамадска-палітычнага жыцця, 32,1 % – сацыяльна-эканамічнага развіцця, а 21,4 % – духоўнага жыцця беларускага народа.

У ходзе вывучэння гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. вучні павінны засвоіць **наступныя паняцці** (табліца 1):

*Табліца 1*

**Пералік асноўных паняццяў па гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.**

| Назва раздзела | Асноўныя паняцці |
|---|---|
| Раздзел 1. «Беларусь на зыходзе феадалізму: канец XVIII – сярэдзіна XIX ст.» | Аўтаномія, план Агінскага, філаматы, філарэты, шляхецкае паўстанне, «разбор» шляхты, мяжа яўрэйскай аселасці, Полацкі царкоўны сабор, сялянская абшчына, фальваркова-паншчынная сістэма, рэформа П. Кісялёва, інвентарная рэформа, беларусазнаўства, ланкастэрская школа |



Рэпазіторый БДПУ